# ДАДАТАК Б

## Прадуктыўнасць мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова

У дадатку адлюстравана ступень прадуктыўнасці мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова на аснове рода-відавой класіфікацыі. Факталагічны матэрыял у ім сістэматызаваны з улікам тыпалагічнай характарыстыкі аб’екта. Кожны семантычны тып прадстаўлены ў асобным параграфе, напрыклад, Б.1 – *дынамічна-лакатыўны* тып. Далейшы падзел унутры кожнага тыпу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з відавым класам, напрыклад, *рух аб’екта ад пачатковага пункта*. Пасля падаецца мадэль (адна або некалькі), што можа рэалізаваць семантыку адпаведнага віду, напрыклад, *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт.* Затым адлюстравана колькасць структурных схем, якія рэпрэзентуюць семантычную мадэль (напрыклад, Pron $Pers_{nPlur}$ – Ø – $N_{gPlur}$), і адпаведная ілюстрацыя. Пасля прыкладаў прадстаўлены колькасныя даныя, напрыклад, мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт* рэалізуецца ў 9 структурных схемах.

***Умоўныя абазначэнні***

| **Часціны мовы** | **Склоны** | **Лікі** |
|---|---|---|
| N – назоўнік<br>Pron Pers – займеннік<br>Adv – прыслоўе<br>Adj – прыметнік<br>Ø – незамешчаная сінтаксічная пазіцыя | N – назоўны<br>G – родны<br>D – давальны<br>A – вінавальны<br>L – творны<br>I – месны | Sing – адзіночны<br>Plur – множны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ